НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Аб’ект аўтарскага права
УДК 821.161.3.09(043.3)

КАРП
Алена Аляксандраўна

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ЭСТЭТЫЧНЫ ДЫСКУРС

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

Мінск, 2023

Навуковая работа выканана ў філіяле
«Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Навуковы кіраўнік — **Тычына Міхась Аляксандравіч**
доктар філалагічных навук

Афіцыйныя апаненты — **Мельнікава Анжэла Мікалаеўна,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры беларускай літаратуры УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Лапцёнак Ірына Браніславаўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Апаніруючая арганізацыя — УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Абарона адбудзецца «29» сакавіка 2023 года ў 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, e-mail: inlinasbel@tut.by; тэл.: 270-18-85).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 15). Аўтарэферат разасланы «3» лютага 2023 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук — А. І. Богдан

# УВОДЗІНЫ

Літаратурная крытыка займае істотнае месца ў сістэме літаратуразнаўчых навук і адыгрывае важную ролю ў літаратурным працэсе. У. Конан звяртаў увагу на выяўленне ў ёй эстэтычнай думкі, называў эстэтыку тэарэтычнай асновай для літаратурна-мастацкай крытыкі. Падобнай думкі прытрымліваліся і іншыя даследчыкі: так, Ф. Брунецьер сцвярджаў, што крытыка з’яўляецца прымяненнем на практыцы пэўнай эстэтыкі.

Пры належным стане свайго развіцця крытыка фарміруе сістэму іерархій і такім чынам выбудоўвае нацыянальны канон, а таксама вызначае вектар развіцця літаратуры, фармулюе актуальныя для свайго часу ідэі. Істотна, што эстэтычныя прынцыпы і ідэалы не застаюцца нязменнымі, цягам часу адбываецца іх карэкціроўка. Таму бачыцца актуальным звярнуцца да эстэтычнага дыскурсу крытыкі першай трэці XX ст., бо менавіта тады былі закладзены цвёрдыя эстэтычныя прынцыпы асэнсавання мастацкіх твораў, дзякуючы чаму стала магчымым якаснае, інтэнсіўнае развіццё беларускай літаратуры. Тагачасная крытыка была публічнай дзейнасцю з шырокай сферай уплыву, што ўключала мастацкую літаратуру, грамадскую думку, працу літаратурных інстытуцый. Гэта робіць яе досвед каштоўным для сучаснай крытыкі, стан якой нельга лічыць аптымальным.

Нягледзячы на пэўную колькасць прац, прысвечаных крытыцы першай трэці XX ст., гэтую тэму ў беларускім літаратуразнаўстве нельга лічыць вычарпанай. Пасля фундаментальнай працы М. Мушынскага «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады)» (1975 г.) крытыка адпаведнага перыяду практычна не выступала як самастойны аб’ект даследавання. Выключэнне складае манаграфія К. Мароз «Літаратурная крытыка Заходняй Беларусі» (2001 г.). Канцэптуальна і на высокім навуковым узроўні крытыка нашаніўскага перыяду разглядаецца ў манаграфіі Т. Вабішчэвіч «Станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі (1900–1910-я гг.): фактары, механізмы, этапы», аднак у гэтай працы крытыка цікавіла даследчыцу найперш праз прызму абазначанай у назве праблемы. Асобныя артыкулы па тэме ў перыядычным друку, зборніках навуковых прац не адмяняюць неабходнасці сістэмнага даследавання. Па-ранейшаму няма падручніка для ВНУ, прысвечанага пытанням тэорыі і гісторыі айчыннай літаратурнай крытыкі – ад вытокаў да сучаснасці. Таму распрацоўка тэмы мае таксама практычнае значэнне.

У працы выкарыстоўваецца паняцце эстэтычнага дыскурсу, што дазваляе ўлічыць, з аднаго боку, камунікатыўную прыроду крытыкі, з іншага – выяўленне ў ёй эстэтычнай думкі.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыя выканана ў аддзеле тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры ў межах НДР «Гісторыя беларускага літаратуразнаўства (XI–XXI стст.)» (кіраўнік – д.ф.н., дац. Кісліцына Г. М.) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства»; НДР «Сістэма родаў, відаў і жанраў беларускай літаратуры ў дынаміцы літаратурнага працэсу» (кіраўнік – д.ф.н., дац. Кісліцына Г. М.) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы».

**Мэта і задачы дысертацыйнага даследавання. Мэта**: вылучыць асаблівасці станаўлення і развіцця эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы, паказаць яго пераемнасць і дэтэрмінаванасць на матэрыяле крытычных тэкстаў 1900–1930-х гг.

**Задачы**, якія неабходна вырашыць для дасягнення пастаўленай мэты:

прасачыць фарміраванне эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы нашаніўскага перыяду і акрэсліць значэнне яе набыткаў у далейшым развіцці крытычнай думкі Беларусі;

раскрыць ролю эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1920-х гг., прадставіць яе ідэі, метады, каштоўнасную парадыгму, сувязь з нашаніўскай традыцыяй;

паказаць спецыфіку функцыянавання эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1930-х гг.;

вылучыць асаблівасці рэалізацыі крытыкі першай трэці XX ст. як камунікатыўнага акта, вызначыць яе адрасата.

**Аб'ектам даследавання** дысертацыйнай работы з'яўляюцца літаратурна-крытычныя працы першай трэці XX ст., прадстаўленыя ў выданнях «Наша ніва», «Полымя», «Маладняк», «Узвышша», а таксама ў зборах твораў М. Багдановіча, В. Ластоўскага, С. Палуяна, А. Луцкевіча, Л. Гмырака, М. Гарэцкага, А. Бабарэкі, Ант. Адамовіча, Я. Коласа і інш.

**Прадмет даследавання** – функцыянаванне эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы першай трэці XX ст.: тэндэнцыі, якія выявіліся ў ёй у розныя перыяды; ідэі і эстэтычныя каштоўнасці, што сцвярджаліся крытыкамі; выбудоўванне канона; крытэрыі ацэнкі мастацкіх твораў; пытанні камунікатыўных стратэгій крытыкаў: пабудова крытычнага выказвання, аўтарскія пазіцыі, стыль, уяўленні пра імпліцытнага чытача.

**Метадалагічная база.** Зыходзячы з мэт і задач даследавання, як асноўныя абраны метады структуралізму, постструктуралізму, дыскурс-

аналізу, а таксама культурна-гістарычны і метад цэласнага інтэграцыйнага аналізу. Выбар менавіта гэтых метадаў тлумачыцца неабходнасцю тэарэтычнага, навукова дакладнага асэнсавання літаратурнай крытыкі, а таксама патрэбай вытрымаць прынцып гістарызму, сістэматызаваць атрыманыя вынікі, каб мець цэласнае, поўнае ўяўленне пра літаратурную крытыку першай трэці ХХ ст.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў.** Упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве крытыка першай трэці ХХ ст. разглядаецца непарыўна на працягу трох асобных, аднак узаемазвязаных перыядаў: нашаніўскага, 1920-х і 1930-х гг. Новым для даследавання гэтай тэмы з'яўляецца абраны ракурс – эстэтычны дыскурс, што дазваляе комплексна прааналізаваць тагачасную крытыку, улічыць яе камунікатыўную прыроду.

Дзеля паўнаты даследавання ў працы характарызуецца творчасць не толькі вядучых, але і малавядомых дагэтуль крытыкаў, удакладняюцца ўяўленні пра спадчыну вядомых. Асобны раздзел прысвечаны А. Луцкевічу, чыё імя доўгі час не ўводзілася ў шырокі навуковы ўжытак. Між тым яго крытычная практыка вартая глыбокага навуковага асвятлення, што і зроблена ў працы. Упершыню паказаны ўплыў ідэй украінскага даследчыка А. Бялецкага на крытычную практыку А. Бабарэкі, Ю. Бярозкі.

У сувязі са спецыфікай развіцця айчыннай літаратуры ў першай трэці ХХ ст. у якасці літаратурна-крытычнага матэрыялу разглядаюцца не толькі ўласна крытычныя жанры, але і спарадычныя выяўленні крытычнай думкі, асабліва ўласцівыя нашаніўскаму перыяду. Прымяненне гісторыка-кантэкснага метаду дазваляе акрэсліць пазалітаратурны кантэкст, рэдакцыйную палітыку, выяўленую ў паметах, суправаджальных нататках, лістах. Таксама раскрываюцца маладаследаваныя або зусім не даследаваныя ў айчынным літаратуразнаўстве пытанні станаўлення прафесійнай этыкі, функцыянавання літаратурнага рынку, стварэння рэпутацый і фарміравання канона.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Беларуская літаратурная крытыка першай трэці ХХ ст. ажыццяўляла шырокі спектр функцый, разумелася яе стваральнікамі як сродак дзейснага ўплыву на літаратуру, таму не толькі інтэрпрэтавала і ацэньвала мастацкія творы, але і вызначала вектар развіцця літаратуры. Акрамя таго, у нашаніўскі перыяд крытыка нароўні з мастацкай літаратурай удзельнічала ў фарміраванні і ўмацаванні нацыянальнай свядомасці, уключалася ў вырашэнне пытанняў нацыянальнага адраджэння. Актыўнасць крытыкі, вырашэнне ёй не толькі эстэтычных, але і важных грамадскіх задач у 1910–1920-я гг. павышала яе аўтарытэт і было пазітыўнай з'явай; пашырэнне

функцый крытыкі да цэнзарскіх, што адбылося ў 1930-я гг., стала прычынай яе крызіснага стану.

2. Станаўленне і сцвярджэнне эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы першай трэці XX ст. мела пэўныя складанасці. У нашаніўскі перыяд праблема заключалася не толькі ў неспрыяльных знешніх умовах, але і ў непадрыхтаванасці аўдыторыі (што было натуральна на тым гістарычным этапе), нешматлікай колькасці нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі, здольнай уключацца ў літаратурную працу. У 1920–1930-я гг. эстэтычнай крытыцы даводзілася пераадольваць ціск сацыялагічнага падыходу. Тым не менш уважлівая, сур'ёзная праца з эстэтычнымі катэгорыямі, ацэнка твора паводле мастацкай якасці ўвайшлі ў крытычную практыку.

3. У 1920-я гг. рэпутацыя нашаніўскай літаратуры не была строга вызначанай. З аднаго боку, нашаніўская традыцыя адмаўлялася як народніцкая, ідэалагічна састарэлая. З іншага, асобныя аўтары, найперш прадстаўнікі літаб'яднання «Узвышша», прызнавалі і працягвалі традыцыі нашаніўскай крытыкі. Так, эстэтычнай крытыкай 1920-х гг. аказалася запатрабаванай сфармуляваная нашаніўцамі канцэпцыя, што прадугледжвала спалучэнне нацыянальнай адметнасці літаратуры (пры гэтым выяўленай на еўрапейскім мастацкім узроўні) і агульначалавечага зместу. Таксама крытыка ў гэты перыяд працягвала працаваць з пытаннямі зместу і формы, традыцыі і наватарства і прыходзіла ў выніку да высноў, якія супадалі з агучанымі папярэднікамі-нашаніўцамі. Акрамя іншага, аўтары, што валодалі высокім прафесійным узроўнем, арыентаваліся на нашаніўскую крытыку як на ўзор аналітычнасці і ўдалага стылістычнага афармлення. Таму можна казаць пра істотны яе ўплыў, хоць ва ўмовах пэўнай дэкларатыўнасці, канвенцыйнасці, што ўсталявалася ў літаратуры ў савецкі перыяд, нашаніўская традыцыя не магла трапіць у канон бесперашкодна і трывала.

4. Перыяд 1920-х гг. засведчыў канфлікт паміж эстэтычным і ідэалагічным дыскурсам у крытыцы. Разам з тым апалагеты абодвух падыходаў да літаратуры – эстэтычнага і сацыялагічнага – заставаліся практычна раўнапраўнымі. Канфлікт яшчэ не быў настолькі вострым, як у 1930-я гг., і пазіцыі ў ім яшчэ не вызначыліся адназначна. Прэферэнцыі крытыкаў, прыхільнасць іх да эстэтычнага або сацыялагічнага падыходу выразна выяўляліся ў тым, як вырашалася імі актуальная задача стварэння нацыянальнага канона, якія ацэнкі і характарыстыкі набывалі пэўныя аўтары: такой вызначальнай фігурай-маркерам у названы перыяд быў, у прыватнасці, М. Багдановіч. Сучаснае літаратуразнаўства пацвердзіла правамоцнасць канона, выбудаванага паводле эстэтычных прынцыпаў.

5. У крытыцы пачатку ХХ ст. выразна выяўлены камунікатыўны пачатак. Нашаніўская крытыка характарызуецца паслядоўнай арыентаванасцю на свайго патэнцыйнага чытача, імкненнем усталяваць з ім кантакт, а таксама звернутасцю да аўтараў, ад якіх чакалася рэалізацыя канкрэтных эстэтычных праграм развіцця літаратуры. Крытыка 1920-х гг. працягнула гэтую традыцыю. Уяўленні крытыкаў пра патэнцыйнага чытача ўплывалі на рэдакцыйную палітыку, на функцыянаванне літаратурнага рынку. У 1930-я гг. крытыка вылучалася найбольшай дырэктыўнасцю і імкнулася ўплываць на літаратурны працэс, звяртаючыся непасрэдна да літаратурных інстытуцый.

**Асабісты ўклад дысертанта.** Дысертацыйная работа з’яўляецца самастойным даследаваннем. Публікацыі па тэме дысертацыйнага даследавання выкананы без суаўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў вывучэнне беларускай літаратурнай крытыкі першай трэці ХХ ст.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі 08.09.2022 г. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання асвятляліся ў дакладах і выступленнях на 13 міжнародных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях: Міжнароднай навуковай канферэнцыі да 100-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры А. Куляшова «Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць», Мінск, 29 студзеня 2014 г.; 71-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў БДУ, Мінск, 23 красавіка 2014 г.; Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі да 90-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі «Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры», Мінск, 26–27 лютага 2015 г.; ХХІХ навуковай канферэнцыі «Каласавіны», прысвечанай 133-й гадавіне з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Мінск, 3 лістапада 2015 г.; Першым міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры, Мінск, 5–6 мая 2016 г.; XIV Архіўных чытаннях, прысвечаных 125-годдзю Максіма Багдановіча, Аркадзя Смоліча і Івана Цвікевіча, Мінск, 4 кастрычніка 2016 г.; XVII Узвышаўскіх чытаннях, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння гісторыка, пісьменніка і публіцыста Міхася Мялешкі, Мінск, 26 мая 2017 г.; Капыльскіх чытаннях да 130-годдзя Зміцера Хведаравіча Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Капыль, 20 кастрычніка 2017 г.; ІІ Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы

рэпрэзентацыі», Мінск, 15–16 лістапада 2018 г.; XIX Узвышаўскіх чытаннях, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння крытыка, празаіка, філосафа Адама Бабарэкі, Мінск, 24 мая 2019 г.; III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце», Віцебск, 20–21 лістапада 2019 г.; 84-й навукова-тэхнічнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў БДТУ (з міжнародным удзелам), Мінск, 3–14 лютага 2020 г.; Міжнародных навуковых чытаннях «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах», Гомель, 4–5 кастрычніка 2022 г.

**Апублікаванасць вынікаў.** Матэрыялы даследавання адлюстраваны ў 14 публікацыях: 4 артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (1,96 аўт. арк.), 7 публікацый матэрыялаў выступленняў на навуковых канферэнцыях (2,17 аўт. арк.), 1 тэзісы дакладаў (0,17 аўт. арк.), 2 публікацыі ў перыядычным друку (0,7 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 5 аўтарскіх аркушаў.

**Структура і аб'ём работы.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, аналітычнага агляду літаратуры па тэме дысертацыі, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (247 назваў, з іх 233 – спіс выкарыстаных крыніц, 14 – публікацыі саіскальніка). Аб'ём даследавання – 126 старонак, са спісам літаратуры – 143 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У працы прадстаўлены **«Аналітычны агляд літаратуры па тэме даследавання»**, дзе раскрываецца гісторыя пытання, разглядаюцца аўтарскія дэфініцыі крытыкі, выкладаюцца этапы яе навуковага асэнсавання. Увага звернута на працы Ф. Брунецьера, Дж. Рэнсама, Р. Барта. Падкрэсліваецца, што першапачаткова прызначэнне і прынцыпы крытычнай дзейнасці асэнсоўваліся непасрэдна ў літаратурна-крытычных творах. У савецкім літаратуразнаўстве навуковае вывучэнне крытыкі актывізавала пастанова ЦК КПСС «Пра літаратурна-мастацкую крытыку» 1972 г., пасля якой выйшаў шэраг прац па тэме: Ю. Борава, Б. Лук'янава, Т. Шчукінай – у рускім літаратуразнаўстве, М. Мушынскага, В. Каваленкі – у айчынным.

Паколькі беларуская крытыка 1920–1930-х гг. знаходзілася ва ўзаемасувязі з рускай, вылучаныя і прааналізаваныя найбольш грунтоўныя працы рускіх аўтараў, прысвечаныя крытыцы гэтага часу: Г. Белай, С. Шашукова, У. Перхіна, Я. Дабрэнкі і Г. Ціханава. Але вядучае значэнне для мэт дысертацыі маюць даследаванні айчынных навукоўцаў. Сярод іх ахарактарызаваны працы У. Конана, які адным з першых пачаў даследаваць

крытычную думку Беларусі ў сувязі з эстэтыкай; М. Мушынскага, чыя манаграфія «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады)» з'яўляецца на сёння найбольш поўным, сістэмным даследаваннем па тэме. Сваім факталагічным матэрыялам, дакладнасцю навуковай метадалогіі каштоўныя працы Т. Вабішчэвіч, В. Жыбуля.

У главе 1 **«Станаўленне эстэтычнага дыскурсу ў нашаніўскі перыяд»** на падставе матэрыялаў газеты «Наша ніва», а таксама прац асобных, найбольш значных аўтараў гэтага перыяду прааналізаваны эстэтычны дыскурс беларускай літаратурнай крытыкі на этапе яе ўзнікнення і фарміравання.

У раздзеле 1.1 **«Станаўленне і эвалюцыя крытычнай думкі газеты «Наша ніва» (1906–1915)»** паказана развіццё літаратурнай крытыкі ў нашаніўскіх публікацыях. Прасочваецца яе эвалюцыя ад нерэгулярных няўласна крытычных жанраў (рубрыка «Паштовая скрынка», інфармацыйныя нататкі, вершы) да асваення ўласнай жанравай сістэмы (рэцэнзія, агляд, палемічны артыкул) і сталага месца ў выданні.

Сцвярджаецца вызначальная роля пераарыентацыі «Нашай нівы» на мадэрнізацыю і ўніверсалізацыю, што адбывалася ў 1909–1910 гг., у якасным росце крытычнай і эстэтычнай думкі. На гэтым этапе пашырыўся яе катэгарыяльны апарат, узбагацілася каштоўнасная парадыгма. Інтарэс крытыкаў да пэўнага аўтара, ацэнка яго творчасці дыктаваліся ўжо не выключна грамадскімі ідэаламі, улічвалася таксама эстэтычная вартасць. Адпаведна, з цягам часу больш строгія патрабаванні прад'яўляліся крытыкамі да маладой беларускай літаратуры, яе мастацкага афармлення, актуальнасці адносна еўрапейскага кантэксту, што яскрава засведчыла нашаніўская дыскусія 1913 г.

Раздзел 1.2 **«Ідэйна-эстэтычныя асновы нашаніўскай крытыкі ў працах В. Ластоўскага, С. Палуяна, М. Багдановіча»** прысвечаны творчасці аўтараў, якія ў сваёй крытычнай практыцы былі скіраваны на тое, каб вызначаць вектар развіцця беларускай літаратуры, спрыяць яе мадэрнізацыі, росту мастацкай вартасці.

Патрэбы нацыянальнага адраджэння актуалізавалі ідэю служэння свайму народу, абумовілі заангажаванасць крытыкаў нацыянальнымі інтарэсамі, іх асветніцкую дзейнасць. Пры гэтым В. Ластоўскі, М. Багдановіч, С. Палуян ацэньвалі ідэйны змест і мастацкую вартасць твора як аднолькава значныя. Названыя крытыкі прапаноўвалі ў якасці перспектыўнага шляху развіцця беларускай літаратуры выяўленне нацыянальнай адметнасці як сродак больш глыбокай, арганічнай яе рэцэпцыі беларускім чытачом і як гарантыю яе ўнікальнасці для замежнага чытача, а таксама актыўнае засваенне досведу еўрапейскіх літаратур. Такім чынам, стратэгія пераадолення

«этнаграфізму» маладой беларускай літаратуры заключалася ў адзінстве нацыянальнага стылю і агульначалавечага зместу.

У раздзеле прааналізаваны эстэтычныя погляды разглядаемых аўтараў, выяўлена іх падабенства і адметнасці стылю кожнага, падкрэслена роля М. Багдановіча ў развіцці метадалогіі айчыннай літаратурнай крытыкі.

Раздзел 1.3 **«Літаратурная крытыка А. Луцкевіча ў святле дыскурснага аналізу»** прызваны даследаваць нашаніўскі перыяд творчасці крытыка, пачынаючы ад самых ранніх тэкстаў «Маладая Беларусь» (1911 г.) і «Мае ўвагі» (1912 г.), якія знаходзяцца на памежжы крытыкі і публіцыстыкі. Такая стратэгія была абумоўлена пазалітаратурнымі фактарамі – неабходнасцю супрацьстаяць шавінісцкай рыторыцы. Надалей сацыялагічны і эстэтычны падыход у крытыцы А. Луцкевіча разумна ўраўнаважваліся. Выбар інструментарыю, метаду даследавання залежаў ад таго, які пачатак – грамадзянскі або парнаскі – больш выразна рэалізаваўся ў творчасці аўтара.

На падставе аналізу рэферэнтных, крэатыўных і рэцэптыўных кампетэнцый крытычных тэкстаў А. Луцкевіча даказана, што ў яго крытыцы рэалізуецца стратэгія маналагічнай згоды. Рэцыпіент мусіць усвядоміць данесеныя да яго імператывы і скарэктаваць свае погляды ў адпаведнасці з імі. Ідэальны рэцыпіент А. Луцкевіча – гэта носьбіт аднолькавага з аўтарам культурнага коду. Аднак аўтар імкнуўся пашырыць чытацкае кола, уключыць у яго і інтэлігентаў, і – на роўных правах – вяскоўцаў, што адпавядала дэмакратычным устаноўкам «Нашай нівы».

У главе 2 **«Праблемы і набыткі эстэтычнага дыскурсу ў крытыцы 1920-х гадоў»** ахарактарызаваны стан эстэтычнага дыскурсу на матэрыяле крытычных тэкстаў, прадстаўленых у найбольш значных тагачасных літаратурна-мастацкіх выданнях: «Полымя», «Маладняк», «Узвышша». Прасочваецца пераемнасць з папярэднім перыядам, паказана ўзаемадзеянне паміж літаратурнымі супольнасцямі.

Раздзел 2.1 **«Крытыка часопіса «Полымя»: пошук кампрамісу паміж свабодай і дырэктыўнасцю»** выяўляе адметнасць палымянскай крытыкі, а разам з тым спецыфіку тагачаснага літаратурнага працэсу.

У падраздзеле 2.1.1 **«Аксіялагічныя і метадалагічныя аспекты»** прадэманстравана неаднароднасць палымянскай крытыкі 1920-х гг. паводле прафесійнага ўзроўню, сістэмы каштоўнасцей, метадалагічных прынцыпаў. Падкрэсліваецца вызначальная роля праграмных заяў, сфармуляваных у артыкуле «Нашы заданні», згодна з якімі пралетарскі, рэвалюцыйны характар літаратуры пастуліраваўся як адна з яе найвялікшых вартасцей і частка паспяховай аўтарскай стратэгіі. Адначасова абазначалася апазіцыя паміж нацыянальна арыентаванай нашаніўскай і інтэрнацыянальнай пралетарскай літаратурай.

Паказана дырэктыўнасць палымянскай крытыкі: быў вызначаны вядучы мастацкі метад (рэалізм), рэгламентаваліся літаратурны герой («чысты высакапробны пралетар»), актуальныя тэмы. Мастацкае афармленне твора, яго эстэтычная вартасць для часткі крытыкаў не мелі вядучага значэння. Нягледзячы на гэта, у пытаннях эстэтычных і метадалагічных прыхільнасцей крытыкаў дапускалася пэўная свабода. Пры першаснасці ідэйнага зместу крытыкай усё ж ацэньвалася і мастацкасць, пісьменніцкая тэхніка. Два погляды на літаратуру, класавы і эстэтычны, канфліктавалі паміж сабой, аднак апалагеты абодвух падыходаў у 1920-я гг. мелі магчымасць публікавацца ў «Полымі», што дазваляе лічыць названы перыяд дастаткова спрыяльным.

Звернута ўвага на жанравае багацце, метадалагічную разнастайнасць палымянскай крытыкі. Найбольш пашыранымі былі біяграфічны і культурна-гістарычны метады, практыкаваўся таксама культуралагічны. Як прыярытэтны, аднак, пастуліраваўся метад марксісцкай крытыкі, які на справе рэдуцыраваўся да сацыялагічнага і эканамічнага дэтэрмінізму, таму не спрыяў развіццю крытычнай думкі. Падкрэслена роля аўтараў, якія падтрымлівалі літаратуразнаўчую думку выдання на высокім прафесійным узроўні, сярод іх І. Замоцін, У. Чаржынскі, А. Вазнясенскі, С. Замбржыцкі, М. Піятуховіч.

У падраздзеле 2.1.2 **«Персаналіі і камунікатыўныя стратэгіі»** характарызуецца творчасць найбольш аўтарытэтных крытыкаў, што друкаваліся ў «Полымі», а таксама разглядаюцца асаблівасці выяўленых у крытыцы камунікатыўных стратэгій. Даказваецца, што найперш прафесійныя літаратуразнаўцы фарміравалі навуковы дыскурс і сцвярджалі эстэтычны, які ў пэўнай ступені быў дыскрымінаваны праз вульгарныя, спрошчаныя падыходы. Так, артыкулы У. Чаржынскага вылучаюцца строгай лагічнасцю, увагай да тэарэтычных пытанняў, працай з катэгорыямі эстэтыкі, арыентацыяй на сусветную культуру. Арыгінальнасць мыслення, паслядоўнасць у метадалогіі, акадэмічны ўзровень дэманстраваў прафесар І. Замоцін. Варта адзначыць таксама малавядомага цяпер К. Гарабурду, які ў сваіх рэцэнзіях лаканічна вызначаў сутнаснае, разбіраў творы прадметна, шукаў у іх навізну.

Камунікатыўныя стратэгіі адрозніваліся ў залежнасці ад выбару аўтараў на карысць эстэтычнай або сацыялагічнай крытыкі. Этычныя нормы ў крытыцы вытрымліваліся не заўсёды.

Рэцыпіентам мастацкай літаратуры ўяўляўся масавы чытач-пралетарый, на ўзровень якога крытыка заклікала арыентавацца аўтараў. Стратэгія, разлічаная на тое, каб адпавядаць непатрабавальным густам малаадукаванага чытача, выразна супярэчыла той, што фарміравалася ў нашаніўскай дыскусіі 1913 г. Аднак эстэтычная крытыка ў «Полымі» ігнаравала гэтую пазіцыю і не ставіла аўтара ў залежнасць ад масавага чытача.

Раздзел 2.2 **«Паміж мастацкім і сацыяльным: прыярытэты маладнякоўскай крытыкі»** асвятляе сістэму эстэтычных поглядаў, што сфарміравалася ў літаратурнай крытыцы часопіса «Маладняк».

У падраздзеле 2.2.1 **«Ідэйныя і эстэтычныя каштоўнасці»** на падставе праграмных заяў аб’яднання, ключавых крытычных выступленняў акрэслена каштоўнасная парадыгма маладнякоўскай крытыкі. Ахарактарызавана праца ў галіне эстэтычнай крытыкі А. Бабарэкі, У. Дубоўкі, М. Аляхновіча, З. Бядулі, М. Каспяровіча. Раскрываецца выяўлены ў маладнякоўскай крытыцы канфлікт з «Узвышшам», а менавіта несупадзенне крытычных стратэгій (узвышаўцаў абвінавачвалі ў фармалізме) і адрознае ўяўленне пра канон нацыянальнай літаратуры.

Вызначана, што маладнякоўская крытыка імкнулася прытрымлівацца марксісцкіх прынцыпаў. Ёй была ўспрынята арыентацыя на стварэнне пралетарскай па змесце і нацыянальнай па форме літаратуры, аднак большая ўвага надавалася аналізу зместу і ідэалагічнай скіраванасці аўтараў. Істотнай задачай для крытыкі было вызначыць месца літаратурнай спадчыны і выбудаваць такім чынам нацыянальны канон. Пры гэтым актыўна прадпрымаліся спробы стварыць яго з нуля, прызнаўшы найбольш вартай, па-мастацку дасканалай і сацыяльна значнай менавіта пралетарскую літаратуру, адлік існавання якой пачынаўся з часу стварэння аб’яднання. Адначасова лозунг вучобы ў класікаў змушаў звяртацца да беларускай і сусветнай спадчыны, а прафесійная прынцыповасць асобных аўтараў схіляла да таго, каб праз цэласны аналіз, а таксама пошук адпаведных ракурсаў сцвердзіць каштоўнасць творчасці папярэднікаў. Таму ў маладнякоўскай крытыцы не было выпрацавана адназначнае, агульнае для ўсіх яе аўтараў стаўленне да класікі, не былі строга вызначаны рэпутацыі асобных аўтараў-нашаніўцаў.

Падраздзел 2.2.2 **«Адметнасці стылю, метадалогіі і камунікатыўных стратэгій»** паказвае адметнасць прафесійных падыходаў і стылістыкі маладнякоўскай крытыкі. Як узор удумлівай, сур’ёзнай працы разглядаюцца крытычныя выступленні Я. Пушчы, які асэнсоўваў месца беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай, абапіраўся на катэгорыю нацыянальнага, прытым, як і нашаніўскія аўтары, сцвярджаў патрэбу балансу, ураўнаважанасці нацыянальнага і ўніверсальнага; У. Чаржынскага, які практыкаваў навуковы падыход, разглядаў твор на розных узроўнях, сярод крытэрыяў ацэнкі вылучаў «крышталёвасць з боку фармальна-мастацкага выяўлення»; А. Бабарэкі, які прапаноўваў для беларускай літаратуразнаўчай навукі культуралагічны падыход, а ва ўласных тэкстах спалучаў фенаменалогію, герменеўтыку, псіхалагічны метад.

Адзначаны таксама праблемы маладнякоўскай крытыкі: спрошчаныя, вульгарныя падыходы, непацверджаныя ацэнкі, унутраныя супярэчнасці і

непаслядоўнасць. Паказана, як адрэфлексоўваліся ўнутры яе праблемы этычнага характару.

Падкрэсліваецца, што маладнякоўская крытыка вылучалася экспрэсіўнасцю, часта яе тэксты былі набліжаны да мастацкай літаратуры, мелі эсэістычны характар (А. Бабарэка, У. Дубоўка), выкарыстоўвалі сродкі мастацкай выразнасці. Іншым бокам экспрэсіўнасці была зніжанасць стылю, параўнанні з бытавой сферы.

Аналізуюцца функцыі маладнякоўскай крытыкі, у тым ліку яе спробы ўплываць на літаратурныя інстытуты, напрыклад, карэктаваць выдавецкую палітыку. Прадстаўленая ў выданні крытыка прэтэндавала на тое, што яна выяўляе патрэбы і пажаданні чытачоў, і, зыходзячы з іх, агучвала рэкамендацыі літаратарам. Заяўлялася арыентацыя на масавага чытача, аднак прызнавалася неаднароднасць гэтай аўдыторыі.

У раздзеле 2.3 **«Эстэтычная парадыгма літаратурнай крытыкі “Узвышша”»** сцвярджаецца высокі прафесійны ўзровень узвышаўскай крытыкі, раскрываецца яе значэнне ў развіцці эстэтычнага дыскурсу.

У падраздзеле 2.3.1 **«Ідэі і прыярытэты»** вызначаюцца эстэтычныя каштоўнасныя арыентацыі ўзвышаўскай крытыкі. Яна стваралася навукоўцамі высокай кваліфікацыі, аўтарамі, якія мелі належны ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі, здольнасці да аналітыкі. Узвышаўскія крытыкі абапіраліся на набыткі замежнага літаратуразнаўства, тэарэтычныя напрацоўкі Р. Гайма, Б. Крочэ, О. Вальцэля, Б. Тамашэўскага, В. Жырмунскага, Б. Эйхенбаума, В. Шклоўскага. Аднак іх прафесійны ўзровень дазваляў таксама ствараць уласную тэорыю на глебе менавіта беларускага матэрыялу (што бачылася прыярытэтным), прапаноўваць арыгінальныя канцэпцыі, шукаць адказы на актуальныя праблемныя пытанні і тым самым працаваць адначасова і на будучыню літаратуразнаўства, і на карысць аўтараў-сучаснікаў.

«Узвышша» заяўляла планы па абнаўленні формаў, павышэнні мастацкай якасці літаратуры, стварэнні актуальных, значных твораў, што адпавядала канцэпцыі аквітызму, скіраванай на ажыўленне беларускай культуры. «Творча-канструкцыйны» шлях развіцця, прапанаваны ўзвышаўскай крытыкай, прадугледжваў арыентацыю на нацыянальную традыцыю і сусветную культуру, засваенне і творчае пераасэнсаванне іх здабыткаў. Паказальна, што А. Бабарэка пры характарыстыцы М. Багдановіча, У. Дубоўкі карыстаўся азначэннямі «нацыянальны» і «культурны» паэт, маючы на ўвазе ўгрунтаванасць гэтых аўтараў у традыцыю, яе арганічнае ўспрыняцце і выкарыстанне, глыбокую засвоенасць найлепшых узораў культурнай спадчыны.

Задачу літаратуры ўзвышаўскія крытыкі бачылі ў этычным і эстэтычным выхаванні, пашырэнні беларусізацыі, рэпрэзентацыі беларускай культуры ў

свеце, што абумоўлівала высокую патрабавальнасць да мастацкай вартасці твораў. Пытанне нацыянальнага стылю, паднятае ў свой час нашаніўскай крытыкай, актуалізавалася ў працах узвышаўцаў у тым ліку ў развагах пра форму і змест. Крытыкі заклікалі разумець нацыянальную форму не спрошчана, не выключна як мову твора. Гэта шырокае паняцце, што ўключае ў сябе ўвесь духоўны капітал, назапашаны традыцыяй: стыль, спецыфічны лад мыслення, нацыянальны характар. Насуперак тэндэнцыі разглядаць форму і змест аўтаномна, узвышаўцы сцвярджалі іх дыялектычнае адзінства. Значэнне ўзвышаўскай крытыкі заключаецца таксама ў тым, што яна фарміравала нацыянальны літаратурны канон паводле мастацкіх якасцей твораў і адначасова карэкціравала пэўныя тэзісы тагачаснай крытыкі, якія ператварыліся ў клішэ і таму перашкаджалі развіццю літаратуры, адэкватнай, незаангажаванай крытычнай ацэнцы.

Падраздзел 2.3.2 **«Задачы, метады і адрасаты»** разглядае асаблівасці функцыянавання ўзвышаўскай крытыкі, яе камунікатыўныя аспекты. Сярод задач, якія ставіла перад сабой крытыка выдання, вылучаюцца ацэнка (актыўна абмяркоўваліся фактары, што ўплываюць на яе адэкватнасць, зменлівасць у часе); аналіз і інтэрпрэтацыя (шукаліся аптымальныя метады цэласнага аналізу); папярэдняя літаратуразнаўчая праца, скіраваная на фарміраванне нацыянальнага канона; інфармаванне чытачоў; дзейсная дапамога аўтарам у тым, каб раскрыць свой творчы патэнцыял; а таксама вызначэнне перспектыўнага шляху развіцця нацыянальнай літаратуры.

У раздзеле паказаны ўплыў на ўзвышаўскіх крытыкаў ідэй А. Бялецкага наконт стварэння гісторыі чытача, а таксама рускай фармальнай школы. Разглядаюцца найбольш запатрабаваныя ўзвышаўскай крытыкай літаратуразнаўчыя метады, адметнасць яе стылістычнага афармлення. Падкрэсліваецца арыентаванасць крытыкі на масавага чытача, асвятляецца чытацкая крытыка, што ўзнікла ў адказ на пошук рэдакцыяй непасрэднага кантакту з аўдыторыяй.

У главе 3 **«Эстэтычны дыскурс у змаганні з вульгарна-сацыялагічнай крытыкай»** даследуецца літаратурная крытыка 1930-х гг., акрэсліваюцца ўмовы яе функцыянавання, аналізуюцца працы, у якіх прэваліруюць эстэтычныя прынцыпы.

У раздзеле 3.1. **«Літаратурная крытыка часопіса «Полымя» 1930-х гадоў»** вылучаюцца тэндэнцыі, што ўсталяваліся ў крытыцы 1930-х гг. і прывялі да маргіналізацыі эстэтычных катэгорый, а таксама катэгорыі нацыянальнага. Разглядаюцца працы, якія адносяцца да прафесійнай і пісьменніцкай крытыкі і ў якіх, насуперак пашыраным у той час вульгарна-сацыялагічным падыходам, рэалізуецца эстэтычны падыход да літаратуры, вытрымліваюцца прынцыпы аб’ектыўнасці і бесстароннасці. Такія аўтары, як

А. Вазнясенскі, М. Ларчанка, Р. Бярозкін, Б. Мікуліч, П. Глебка, В. Вольскі, здзяйснялі філалагічны аналіз тэкстаў, ацэньвалі твор, зыходзячы з таго, наколькі паспяхова рэалізаваны пастаўленыя аўтарам задачы.

Раздзел 3.2 **«Пісьменніцкая крытыка Я. Коласа як альтэрнатыва прафесійнай крытыцы»** звернуты да твораў Я. Коласа як аўтарытэтнага аўтара, які меў працяглы досвед крытычнай працы. Паказана роля крытычнай дзейнасці класіка беларускай літаратуры ў літпрацэсе 1930-х гг.

У падраздзеле 3.2.1 **«Пастуляванне эстэтычных ідэалаў у літаратурнай крытыцы Я. Коласа»** на падставе крытычных тэкстаў класіка рэканструюецца яго эстэтычны ідэал. Я. Колас выказваў як заўвагі агульнага характару, так і патрабаванні да мастацкіх твораў, абумоўленыя іх родавай і жанравай прыналежнасцю. Крытык не адмаўляў сродкаў публіцыстыкі ў літаратуры, паколькі яе неад’емная функцыя – фарміраваць і даносіць да чытача ідэі, уплываць на светапогляд. Ва ўласнай яго крытычнай практыцы эстэтычны дыскурс, які ў 1930-я гг. не прызнаваўся як самакаштоўны, ураўнаважваўся ідэалагічным. Аднак ва ўмовах ідэалагізаванасці літаратуры Я. Колас звярнуўся да яе сутнасных праблем, выказаў прафесійны і ўсебаковы погляд на мастацтва, нагадваў пра ігнараваную эстэтычную функцыю. У якасці арыенціраў для сучасных яму пісьменнікаў крытык называў замежных класікаў, а таксама М. Багдановіча, чыя творчасць была ўзорам высокай мастацкай якасці.

Падраздзел 3.2.2 **«Канцэпцыя літаратурнай крытыкі Я. Коласа і яе рэалізацыя»** раскрывае ўяўленні класіка беларускай літаратуры пра функцыі крытыкі. Разглядаецца паняцце «канкрэтная крытыка», якая, на думку Я. Коласа, мусіла мець практычны характар, уяўляць сабою цэласны аналіз мастацкага твора. Зыходзячы са сваіх уяўленняў пра крытыку як актыўны чыннік літаратурнага працэсу, яго рухаючую сілу, Я. Колас нездавальняюча ацэньваў тагачасны яе стан.

Прынцыповае значэнне крытыкі Я. Коласа 1930-х гг. заключалася ў рэабілітацыі ім мастацкасці, вяртанні ў крытычныя тэксты эстэтычных катэгорый. Я. Колас вызначаў сваю крытыку як пісьменніцкую, аднак яна паспяхова выконвала ролю прафесійнай, якая ў той час не рэалізоўвала свае функцыі ў дастатковай меры.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Традыцыйна роля літаратурнай крытыкі вызначаецца тым, што яна прапануе характарыстыку і ацэнку мастацкіх твораў, акрэслівае літаратурныя іерархіі і выбудоўвае такім чынам канон, інфармуе і арыентуе чытача ў кніжным рынку. Акрамя таго, крытыка здольная вылучаць перспектыўныя напрамкі развіцця літаратуры, скіроўваць яе і актыўна ўплываць на літаратурны працэс. Аднак гэта функцыя не заўжды рэалізуецца ёй як з прычыны незапатрабаванасці ў пэўныя перыяды, так і ў сувязі з тым, што вымагае ад крытыкаў нешараговага ўзроўню аналітычнай думкі, здольнасці да прагназавання. Калі на сучасным этапе цяжка казаць пра такі сур'ёзны ўплыў крытыкі на літаратуру, то ў першай трэці XX ст. беларуская крытыка выконвала свае функцыі ў максімальным аб'ёме і ставіла перад сабой глабальныя задачы.

Найбольш выразна гэта яе асаблівасць была выяўлена ў нашаніўскі перыяд, калі крытыка была актыўна ўключанай у працэс нацыянальнага адраджэння, у вырашэнне не толькі эстэтычных, але і грамадскіх, ідэалагічных, адукацыйных задач. Крытыка ставіла і вырашала прынцыповыя пытанні, датычныя нацыянальнага руху, стварэння і функцыянавання культурных інстытутаў, мела публіцыстычны характар, актыўна ўключалася ў палеміку з шавіністычнымі выданнямі. Літаратура разглядалася як сродак выхавання і ўмацавання нацыянальнай свядомасці, адпаведна, з цягам часу ў працэсе свайго станаўлення крытыка пачала прад'яўляць да яе дастаткова высокія патрабаванні, што ўрэшце былі аформлены ў адпаведную праграму развіцця, якую нашаніўская літаратура паспяхова рэалізавала.

У 1920-я гг. гэтую стратэгію – самастойны пошук вектара развіцця літаратуры – працягвала найперш згуртаванне «Узвышша», якое прапанавала канцэпцыю аквітызму. Узвышаўская крытыка вылучалася выяўленнем у ёй філасофскай думкі, нацыянальнай заангажаванасцю, высокім узроўнем філалагічнай падрыхтоўкі. Гэтыя рысы дазвалялі ёй прэтэндаваць на актыўнае ўздзеянне на літаратурны працэс, якое, аднак, у сілу пазалітаратурных фактараў не ажыццявілася.

Крытыка 1930-х гг. выконвала функцыі, неадпаведныя гэтай галіне літаратуразнаўчых ведаў. Дзейсны ўплыў на літаратурныя інстытуты ў названы перыяд быў праявай цэнзуры і ідэалагічнай барацьбы, што прывяло ў выніку да крызіснага стану літаратурнай крытыкі [1; 2; 4; 6; 10; 12; 13; 14].

2. На ўсіх разгледжаных этапах развіцця эстэтычны дыскурс у крытыцы сцвярджаўся не адразу і зведваў пэўныя перашкоды. У нашаніўскі перыяд

праблему складалі непадрыхтаванасць аўдыторыі, нешматлікасць нацыянальнай інтэлігенцыі, інертнасць у літаратуры, што выяўлялася ў этнаграфізме, невысокім мастацкім узроўні. Першапачаткова нашаніўская крытыка практычна не працавала з эстэтычнымі катэгорыямі, як правіла, яны толькі называліся, але не станавіліся прадметам глыбокага аналізу. Аднак пры пераарыентацыі газеты ў тым ліку на інтэлігенцыю, змене рэдакцыйнай палітыкі і курсе на мадэрнізацыю літаратуры сітуацыя змянілася. Калі ў 1900-я гг. для атрымання станоўчай крытычнай ацэнкі было дастаткова, каб творы выяўлялі дэмакратычныя ідэалы, нацыянальныя інтарэсы, распрацоўвалі беларускую мову як мову мастацкай літаратуры, то з 1909–1910 гг. патрабавальнасць крытыкі вырасла, крытэрыі ацэнкі ўключалі мастацкую вартасць, якасць выканання твора, якая ўважліва аналізавалася.

Пачынаючы з 1920-х гг. у савецкай літаратуры мела месца партыйнае кіраўніцтва, што прыводзіла да нарматыўнасці, дэкларатыўнасці ў крытыцы. Вялікае значэнне надавалася ідэалагічнаму складніку мастацкай творчасці. Праца з эстэтычнымі катэгорыямі стала хутчэй асабістым выбарам аўтараў. Афіцыйна яна не разглядалася як першачарговая задача, а ў 1930-я гг. наогул выцяснялася на перыферыю. Тым не менш беларуская літаратурная крытыка і ў гэты час сцвярджала сваю прафесійнасць тым, што ацэньвала мастацкую вартасць твораў, прапаноўвала цэласны іх аналіз у кантэксце беларускай і замежнай літаратуры і разглядала як прадуктыўную, запатрабаваную менавіта такую крытычную стратэгію [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7].

3. Нягледзячы на неадназначнае, няроўнае стаўленне да нашаніўскай традыцыі, выяўленае ў крытыцы 1920-х гг., можна ўпэўнена казаць пра пераемнасць. Адной з ключавых канцэпцый, прапанаваных нашаніўскай крытыкай, быў «забыты шлях» (фармулёўка М. Багдановіча) – курс на нацыянальны стыль беларускай літаратуры, які грунтаваўся б на крэатыўным пераасэнсаванні народнай творчасці, і крытычнае, нешаблоннае, арыгінальнае выкарыстанне здабыткаў еўрапейскай культуры. Такі шлях бачыўся перспектыўным, бо выводзіў беларускую літаратуру на якасна іншы ўзровень, які забяспечыў бы ёй прызнанне ў свеце; пры гэтым захоўвалася яе ўнікальнасць, самабытнасць, што вылучала яе сярод іншых літаратур.

Характарыстыкі «нацыянальны», «культурны» мелі важнае значэнне ў крытычнай практыцы А. Бабарэкі, які спасылаўся на канцэпцыю М. Багдановіча і прызнаваў яе плённасць. Узвышаўская крытыка прытрымлівалася нашаніўскай традыцыі, сцвярджала значнасць у літаратурнай творчасці нацыянальнага пачатку, а таксама арганічнай засвоенасці чужой культуры. У сваіх найлепшых узорах крытыка 1920-х гг. імкнулася адаптаваць растыражаваную формулу «літаратура, нацыянальная па форме, сацыялістычная (пралетарская, інтэрнацыянальная) па змесце» да

інтарэсаў беларускай літаратуры, паслядоўна настойвала на тым, каб нацыянальная форма не трактавалася спрошчана і не выяўлялася толькі ў мове мастацкага твора.

Актуальнымі заставаліся пытанні суадносін зместу і формы, а таксама традыцыі і наватарства, што, як і ў нашаніўскія часы, вырашаліся на карысць ураўнаважанасці, згарманізаванасці і цэльнасці зместу і формы і аднолькавай увагі да абодвух аспектаў з боку літаратурнай крытыкі, а таксама на карысць арганічнага абнаўлення паэтыкі як натуральнага шляху развіцця літаратуры [1; 2; 4; 14].

4. У 1920–1930-я гг. у крытыцы актуалізавалася задача стварэння нацыянальнага канона. Перыяд 1920-х гг. характарызаваўся неаднастайнасцю, суіснаваннем у крытычнай практыцы розных каштоўнасных парадыгмаў і стратэгій, а таксама магчымасцю адноснага плюралізму, прадстаўленасці ў крытыцы двух асноўных падыходаў – эстэтычнага і сацыялагічнага. Адпаведна, выбудоўванне канона асобнымі крытыкамі або ўнутры літаб’яднанняў выразна выяўляла прэферэнцыі крытыкаў. Так, пры эстэтычным падыходзе ў канон уваходзілі і аўтары-адраджэнцы, што ў будучым стала агульнапрынятым; сацыялагічны падыход схіляў крытыкаў да выбудоўвання апазіцыі паміж дарэвалюцыйнай і рэвалюцыйнай, пралетарскай літаратурай. Якасны рост беларускай літаратуры звязваўся з апошняй, адпаведна, канон адкрываўся імёнамі яе стваральнікаў (А. Александровіч, М. Чарот) пры адначасовым ігнараванні або нівеліраванні здабыткаў папярэднікаў. Разам з тым у беларускай літаратуры ўжо меліся свае класікі: Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, і калі творчасць Я. Купалы і Я. Коласа прынята было дзяліць на перыяды – дарэвалюцыйны і савецкі, то М. Багдановіч быў у пэўным сэнсе спрэчнай фігурай. Яго рэпутацыя паэта чыстай красы патрабавала ад сацыялагічнай крытыкі агаворак і пошуку пэўных ракурсаў, пры якіх ён мог быць упісаны ў канон.

У 1930-я гг. сацыялагічны падыход вызначыўся як вядучы, адбывалася перафарматаванне канона ў сувязі з больш жорсткім палітычным курсам [2; 3; 4; 9].

5. Цягам першай трэці XX ст. выразна выяўляецца камунікатыўная прырода крытыкі. Па-першае, літаратурная крытыка была арыентавана на чытача, што адлюстравалася і ў афармленні крытычных тэкстаў, непасрэднай звернутасці іх да адрасата, і ў спробах асобных крытыкаў, выданняў прадугадваць патрэбы чытачоў, у тым ліку праз усталяванне непасрэднага кантакту з імі. Улічваць чытацкія запыты пісьменнікам было неабходна дзеля выбудоўвання паспяховай аўтарскай стратэгіі, а выдавецтвам і іншым удзельнікам літаратурнага рынку – для яго аптымальнага функцыянавання. Істотна тое, што ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. крытыка выкарыстоўвала паняцце «літаратурны рынак» і клапацілася пра яго развіццё. Па-другое,

адрасатамі літаратурнай крытыкі былі аўтары, пры гэтым крытыка разлічвала на іх рэакцыю, адпаведныя карэкціроўкі. Па-трэцяе, крытычныя тэксты маглі быць звернутыя непасрэдна да калег: акрамя палемікі, такая адрасацыя часам мела на мэце супольнае вызначэнне і ўсталяванне прынцыпаў прафесійнай этыкі, што з'яўлялася актуальнай задачай. Узмацненне дырэктыўнасці ў літаратурнай крытыцы ў 1930-я гг. мела сваім вынікам больш актыўную звернутасць да літаратурных інстытутаў з тым, каб уплываць на актуальны стан літаратурнага працэсу праз карэкціроўку выдавецкіх планаў, прадстаўленасці пэўных аўтараў у друку, зместу школьных праграм і г. д. Аднак найбольш адметнай падаецца стратэгія літаб'яднання «Узвышша», у крытычных працах прадстаўнікоў якога неаднойчы пазначаецца арыентацыя на будучыню – да будучых даследчыкаў і іншых удзельнікаў літаратурнага працэсу. І сёння можна канстатаваць, што яе правамернасць пацверджана важкім унёскам удзельнікаў аб'яднання ў развіццё беларускай літаратуры [1; 2; 4; 8; 10; 13].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання**

Атрыманыя вынікі могуць прымяняцца як матэрыял для падручніка па курсу гісторыі і тэорыі літаратурнай крытыкі, паколькі на сёння існуюць толькі асобныя метадычныя дапаможнікі, прысвечаныя беларускай літаратурнай крытыцы, матэрыялы якіх, як правіла, абмежаваныя пэўным гістарычным перыядам. Такім чынам, ёсць неабходнасць у выданні, прысвечаным гісторыі і тэорыі айчыннай літаратурнай крытыкі – ад вытокаў да сучаснасці, у падрыхтоўцы якога могуць быць задзейнічаныя адпаведныя напрацоўкі.

Прадстаўленыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў далейшым вывучэнні тэмы, а таксама ў выкладчыцкай дзейнасці: пры падрыхтоўцы лекцый, практычных заняткаў і семінараў, прысвечаных беларускай літаратуры першай трэці XX ст., літаратурнай крытыцы гэтага часу. Матэрыялы даследавання могуць рэалізоўвацца як камерцыйны прадукт у выглядзе манаграфіі.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Артыкулы ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК**

1. Карп, А. А. Літаратурная крытыка Антона Луцкевіча нашаніўскага перыяду ў святле дыскурснага аналізу / А. А. Карп // Полымя. – 2014. – № 9. – С. 149–153.

2. Карп, А. А. Літаратурная крытыка Максіма Гарэцкага: канцэпцыя і рэалізацыя / А. А. Карп // Полымя. – 2016. – № 1. – С. 135–141.

3. Карп, А. А. Каштоўнасная парадыгма літаратурнай крытыкі часопіса «Полымя» 1920-х гадоў / А. А. Карп // Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2016. – № 2. – С. 13–17.

4. Карп, А. А. Адам Бабарэка як маладнякоўскі крытык: змена парадыгмы і статусу / А. А. Карп // Полымя. – 2018. – № 1. – С. 139–145.

**Матэрыялы канферэнцый**

5. Карп, А. А. Пісьменніцкая крытыка: Якуб Колас пра паэму «Аманал» Аркадзя Куляшова / А. А. Карп // Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (да 100-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова), Мінск, 29 студз. 2014 г. / Цэнтр даслед. белар. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск, 2014. – С. 399–403.

6. Карп, А. А. Станаўленне і эвалюцыя крытычнай думкі ў газеце «Наша Ніва» (1906–1915 гг.) / А. А. Карп // Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (да 90-годдзя з дня нараджэння І. Я. Навуменкі), Мінск, 26–27 лют. 2015 г. / Цэнтр даслед. белар. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск, 2015. – С. 307–312.

7. Карп, А. А. Літаратурная крытыка «Полымя» 1920-х гадоў: праблемы метадалогіі / А. А. Карп // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры : зб. матэрыялаў, Мінск, Беларусь, 5–6 мая 2016 г. / гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даслед. белар. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі. – Мінск, 2016. – С. 722–725.

8. Карп, А. А. Маргінальныя формы літаратурнай крытыкі ў творчасці Якуба Коласа / А. А. Карп // Каласавіны : матэрыялы XXIX навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 90-годдзю паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». – Мінск, 2016. – С. 89–94.

9. Карп, А. А. Прызыў ударнікаў у літаратуру: як і навошта (на матэрыяле апавядання Цішкі Гартнага «Першы твор») / А. А. Карп // Капыльскія чытанні – 2017: да 130-годдзя з дня нараджэння беларускага грамадскага і дзяржаўнага дзеяча, акадэміка АН БССР, пісьменніка Зміцера

Хведаравіча Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Капыль, 20 кастр. 2017 г. / Цэнтр даслед. белар. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск, 2017. – С. 66–72.

10. Карп, А. А. Літаратурна-крытычная думка Уладзіміра Самойлы / А. А. Карп // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 20–21 лістап. 2019 г. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г. А. Арцямёнак (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2019. – С. 162–166.

11. Карп, А. А. Дыскусія пра паэзію 1940 года ў беларускай літаратуры / А. А. Карп // Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі : зб. навук. арт. па выніках Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 лістап. 2018 г. – Мінск, 2021. – С. 172–178.

**Тэзісы дакладаў**

12. Карп, А. А. Праблемы выдавецкай справы перыяду адраджэння ў літаратурнай крытыцы Сяргея Палуяна [Электронны рэсурс] / А. А. Карп // Принттехнологии и медиакоммуникации : материалы 84-й науч.-техн. конф. профессорско-преподават. состава, науч. сотрудников и аспирантов (с междунар. участием), Минск, 3–14 февр. 2020 г. / отв. за издание И. В. Войтов; УО БГТУ. – Минск, 2020. – С. 99. – Рэжым доступу: https://elib.belstu.by/handle/123456789/34046. – Дата доступу: 05.10.2020.

**Публікацыі ў перыядычным друку**

13. Карп, А. Літаратурная думка Антона Луцкевіча / А. Карп // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 6 чэрв. – С. 7.

14. Карп, А. Пад польскай акупацыяй. Літаратуразнаўчыя штуды штотыднёвіка «Рунь» (1920) / А. Карп // Маладосць. – 2015. – № 2. – С. 138–142.

## РЭЗЮМЭ

**Карп Алена Аляксандраўна**

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ЭСТЭТЫЧНЫ ДЫСКУРС

**Ключавыя словы:** літаратурная крытыка, эстэтычны дыскурс, нацыянальны канон, крытэрыі ацэнкі, камунікатыўныя стратэгіі, літаратуразнаўчыя метады, першая трэць XX ст., нашаніўскі перыяд, 1920-я гг., 1930-я гг., «Полымя», «Маладняк», «Узвышша»

**Мэта даследавання:** вылучыць асаблівасці станаўлення і развіцця эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы, паказаць яго пераемнасць і дэтэрмінаванасць на матэрыяле крытычных тэкстаў 1900–1930-х гг.

**Метады даследавання:** структурны аналіз, дыскурс-аналіз, культурна-гістарычны, метад цэласнага інтэграцыйнага аналізу.

**Асноўныя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве крытыка першай трэці XX ст. разглядаецца непарыўна на працягу трох асобных, аднак узаемазвязаных перыядаў: нашаніўскага, 1920-х і 1930-х гг. Новым для даследавання гэтай тэмы з'яўляецца абраны ракурс – эстэтычны дыскурс, што дазваляе комплексна прааналізаваць тагачасную крытыку, улічыць яе камунікатыўную прыроду.

Ахарактарызавана творчасць не толькі вядучых, але і малавядомых крытыкаў, удакладняюцца ўяўленні пра спадчыну вядомых. Асобны раздзел прысвечаны А. Луцкевічу, чыё імя пэўны час не ўводзілася ў шырокі навуковы ўжытак. Між тым яго крытычная практыка вартая глыбокага навуковага асвятлення, што і зроблена ў працы. Упершыню паказаны ўплыў ідэй украінскага даследчыка А. Бялецкага на крытычную практыку А. Бабарэкі, Ю. Бярозкі.

Раскрываюцца маладаследаваныя або зусім не даследаваныя ў айчынным літаратуразнаўстве пытанні станаўлення прафесійнай этыкі крытычнай дзейнасці, функцыянавання літаратурнага рынку, стварэння рэпутацый і фарміравання канона.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Практычнае значэнне дысертацыі заключаецца ў тым, што яе вынікі дапаўняюць уяўленне пра развіццё крытыкі першай трэці XX ст., а разам з тым пра стан тагачаснай літаратуры наогул. Прадстаўленыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў далейшым вывучэнні тэмы, а таксама ў выкладчыцкай дзейнасці.

# РЕЗЮМЕ

**Карп Елена Александровна**

**БЕЛОРУССКАЯ ЛИТЕРАТУРНАЯ КРИТИКА ПЕРВОЙ ТРЕТИ XX ВЕКА: ЭСТЕТИЧЕСКИЙ ДИСКУРС**

**Ключевые слова:** литературная критика, эстетический дискурс, национальный канон, критерии оценки, коммуникативные стратегии, литературоведческие методы, первая треть XX в., нашенивский период, 1920-е гг., 1930-е гг., «Полымя», «Маладняк», «Узвышша»

**Цель исследования:** определить особенности становления и развития эстетического дискурса в белорусской литературной критике, показать его преемственность и детерминированность на материале критических текстов 1900–1930-х гг.

**Методы исследования:** структурный анализ, дискурс-анализ, культурно-исторический, метод целостного интеграционного анализа.

**Основные результаты и их новизна.** Впервые в белорусском литературоведении критика первой трети XX в. рассматривается непрерывно на протяжении трех отдельных, однако взаимосвязанных периодов: нашенивского, 1920-х и 1930-х гг. Новым в исследовании этой темы является выбранный ракурс – эстетический дискурс, что позволяет комплексно проанализировать критику того времени, учесть ее коммуникативную природу.

Охарактеризовано творчество не только ведущих, но и малоизвестных критиков, уточняются представления про наследие известных. Отдельный раздел посвящен А. Луцкевичу, чье имя долгое время не вводилось в широкий научный обиход. Между тем его критическая практика заслуживает глубокого научного освещения, что и проделано в работе. Впервые показано влияние идей украинского исследователя А. Белецкого на критическую практику А. Бабареки, Ю. Березки.

Раскрываются малоисследованные или вовсе не исследованные в белорусском литературоведении вопросы становления профессиональной этики критической деятельности, функционирования литературного рынка, создания репутаций и формирования канона.

**Практическая значимость полученных результатов.** Практическая значимость диссертации заключается в том, что ее результаты дополняют представление о развитии критики первой трети XX в., а вместе с тем о состоянии литературы того времени. Представленные результаты могут быть использованы в дальнейшем изучении темы, а также в преподавательской деятельности.

## SUMMARY

## Karp Alena

# BELARUSIAN LITERARY CRITICISM IN THE FIRST THIRD OF THE $20^{TH}$ CENTURY: AESTHETIC DISCOURSE

**Keywords:** literary criticism, aesthetic discourse, national canon, evaluation criteria, communicative strategies, literary methods, the first third of $20^{th}$ century, Nasha niva period, the 1920s, the 1930s, Polymia, Maladniak, Uzvyshsha

**The aim of the research:** to define the peculiarities of formation and development of aesthetic discourse in Belarusian literary criticism, to show its continuity and determinism on the material of critical texts of 1900–1930s.

**Methods of the research:** structural analysis, discourse-analysis, cultural-historical, method of holistic integration analysis.

**Main results and their novelty.** For the first time in Belarusian literary criticism of the first third of the 20th century is studied uninterruptedly throughout three separate but interrelated periods: the period of Nasha niva, 1920s and 1930s. A new aspect in the study of this topic is the chosen perspective – aesthetic discourse, which allows a comprehensive analysis of criticism of that time, given its communicative nature.

The works of not only leading, but also little-known critics are characterized, the ideas about the legacy of the famous ones are clarified. A separate section is devoted to A. Lutskievich, whose name has not been introduced into broad academic discourse for a long time. Meanwhile, his critical practice deserves a deep scientific coverage, which is done in the work. The influence of ideas of Ukrainian researcher A. Bialietski on critical practice of A. Babareka, J. Biarozka is shown for the first time.

The questions of formation of professional ethics of critical activity, functioning of literary market, creation of reputation and formation of canon, little-studied or not studied at all in Belarusian literary studies, are revealed.

**The practical significance of the results obtained.** The practical significance of the thesis lies in the fact that its results add to the idea of the development of criticism in the first third of the twentieth century, and at the same time to the state of literature of that time. The presented results can be used in further study of the topic, as well as in teaching activities.

А. Карп

Отпечатано в РУП "Издательский дом "Белорусская наука"
Заказ 22. Тираж 60 экз.